***(Працяг. Пачатак у №№ 67-68, 76-77, 120, 123-124).***

Віллі Шэферэр, якога ў народзе празвалі «Пушынкай», - гэта вельмі адыёзная фігура ў гісторыі нашага горада перыяду акупацыі. Заўсёды ўзброены – з-пад пінжака была бачна жоўтая кабура з пісталетам, у аўтамабілі ці брычцы побач меў аўтамат. Заўсёды разам з ім знаходзіўся нейкі хлопец са шрамам на верхняй губе. Гэты шрам-рубец скрыўляў губы маладога чалавека, за што яго называлі «Крывагубцам». Ад Пушынкі Крывагубец, які таксама заўсёды быў з аўтаматам, не адыходзіў ні на крок. Ён суправаджаў гаспадара ва ўсіх экзекуцыях, расстрэлах, збіеннях, карных акцыях акупантаў супраць партызан ці мірнага насельніцтва. Гэтыя дзве асобы прысутнічалі на пероне, калі са станцыі адпраўляліся эшалоны з людзьмі на прымусовыя работы ў Германію. Былі яны каля возера Мачула, дзе расстралялі мужчын-яўрэяў, каля ямак пры ліквідацыі Лунінецкага гета. Пасля спалення Мелясніцы брычка Пушынкі, якой кіраваў Крывагубец, узначаліла абоз з нарабаваным дабром забітых вяскоўцаў, які павольна рухаўся ў горад па вуліцы Чырвоная. Гэты немец і гэты здраднік прынеслі шмат гора і пакут жыхарам Лунінеччыны, пралілі многа крыві нашых людзей.

Былі і іншыя здраднікі-прыслужнікі, якія нарадзіліся і жылі ў нашым горадзе і ў цяжкую гадзіну сталі на бок ворага. Яны служылі ў паліцыі, вартаўнікамі ў турме, перакладчыкамі ў СД, старастамі і

еннага часу ***(здымак 1)***. Цікава, што на білеце 2 пячаткі. Адна з іх сведчыць, што начальнікам Лунінецкай 3-яй білетнай групы Брэст-Літоўскай чыгункі ў 1941 годзе была Папова. Другая – гэта «пячатка для бясплатных білетаў і нарадаў» гэтай групы.

Другая сямейная рэліквія – фотаздымак бацькі з Дошкі гонару кандуктарскага рэзерву ***(здымак 2)***. Паўтаруся: Дошкі гонару, пакінутыя адступаўшымі ці, дакладней, збегшымі кіраўнікамі арганізацый, для нямецкай паліцыі, гестапа і СД сталі своеасаблівай крыніцай звестак пра савецкіх актывістаў, стаханаўцаў-перадавікоў, ударнікаў, іх наступнага арышту і знішчэння (па фотаздымку з Дошкі гонару быў знойдзены кандуктар Багданец з Вулькі 1 і расстраляны, як і многія іншыя лепшыя працаўнікі). Такую

Між тым некаторыя чуткі пасля вайны пацвярджаліся. Напрыклад, гараджане гаварылі, што ў Мінску партызаны забілі гаўляйтэра. Цяпер усім вядома, што мінскія падпольшчыкі знішчылі В. Кубе. У акупіраваным Лунінцы ведалі пра разгром немцаў пад Масквой, пра акружэнне і палон вялікай арміі фашыстаў пад Сталінградам, пра бітву на Курскай дузе, пра масавае знішчэнне захопнікамі яўрэяў у Кіеве. Нават з далёкага Крыму ў Лунінец дашлі звесткі пра тое, што па заданню Сталіна ў гарах у шматлікіх падземных хадах схавалася вялікая савецкая армія, якая тайна выходзіць адтуль і б'е немцаў *(цяпер ведаем пра падзеі Аджымушкая. –* ***Л.К.)***. Расказвалі пра новую савецкую цуда-зброю «гарматах-кацюшах». Усе гэтыя падзеі былі рэальнасцю вайны, але ў

шы раз – у канцы верасня-пачатку кастрычніка 1941 года. Іх было няшмат – у раёне вуліц Фабрычная, Млынавая, Палявая, Чырвоная. Тэкст быў надрукаваны, відавочна, у палявых умовах, дрэнна бачны, на паловах лістка вучнёўскага сшытка ў лінейку. Лістоўка паведамляла пра выступленне Сталіна 3 ліпеня 1941 года па радыё са зваротам да народа краіны, заклікала дапамагаць Чырвонай Арміі граміць ворага. Трэцяе скідванне лістовак было самым масавым – у маі 1944 года. Тады ўжо і так было зразумела, што набліжаецца вызваленне ад акупацыі.

Пасля знішчэння яўрэйскага гета нямецкія ўлады вырашылі знішчыць застаўшыхся на волі (не змешчаных у гета) так званых «выкрэстаў». Так у Лунінцы называлі сем'і, у якіх муж ці жонка былі яўрэямі, але па розных прычынах потым прынялі хрысціянскую веру, здзейснілі абрад хрышчэння. Іх было некалькі. У пачатку акупацыі (1941-1942) немцы не цікавіліся гэтымі сем'ямі. Але летам 1943 года ўсе «выкрэсты» былі арыштаваны і адразу ж расстраляны на «бензінцы».

Сярод ахвяр была сям'я вядомага ў горадзе гандляра Леана Цхаўрэбава (Цхаўрэбашвілі). Галава сям'і быў афіцэр з каўказскага (татарскага) батальёна кавалерыі генерала Булак-Балаховіча застаўся ў Лунінцы пасля заканчэння польска-савецкай вайны, закахаўся ў яўрэйку Троцкую, адзіную дачку небагатых бацькоў. Заснаваў сваю справу – магазін каланіяльных тавараў: апельсіны, бананы, рызынкі, вінаград і шмат фінікаў. Самыя

# АКУПАЦЫЯ
## (10.07.1941-10.07.1944)












бургамістрамі. Усе яны пакінулі Лунінец у 1944 годзе.

Калі Лунінеччына раптам стала «ўкраінскай тэрыторыяй», сюды хлынулі АУНаўцы. З поўнай згоды нямецкага камандавання і ўлад украінскія нацыяналісты пачалі здзяйсняць свае чорныя задумы: ствараць на Палессі так званую «Украінскую Паўстанцкую Армію» (УПА), вербаваць моладзь у гэту арганізацыю, асабліва вясковую. Яны не скупіліся на абяцанні, пагражалі, дзейнічалі тэрорам і правакацыямі. «Дабраахвотнікаў» было вельмі мала, але яны, так званыя «стральцы», тут жа атрымлівалі зброю і пачыналася навучанне. Пункт запісу ў УПА ў Лунінцы знаходзіўся ў доме, дзе да вайны была гарадская паліклініка (на цяперашняй вуліцы Савецкая). Праіснаваў нядоўга, неяк «мірна сканаў сам па сабе».

Прыгадваў ужо аб тым, што мой бацька да вайны ў 1940-1941 гадах працаваў нарадчыкам кандуктарскіх брыгад на станцыі Лунінец. У пачатку чэрвеня 1941 года ён пайшоў у чарговы водпуск, атрымаў, як чыгуначнік, бясплатны разавы праязны білет і планаваў паехаць з жонкай на некалькі дзён у Львоў, пагледзець горад, купіць сёе-тое для дома. Трэба сказаць, што атрыманне бясплатнага білета суправаджалася невялікай урачыстасцю. У «чырвоным кутку» кандуктарскага рэзерву яны ўручаліся адпускнікам пад апладысменты і прамовы. У выступленнях адзначалася, што да 1939 года просты рабочы чыгуначнік не карыстаўся такой прывілеяй. Аднак вайна перашкодзіла намерам бацькі і маці. Разавы білет застаўся нявыкарыстаным і захаваўся ў сям'і як рэліквія мірнага дава-

ж карціну ўбачылі захопнікі і ў «чырвоным кутку» кандуктарскага рэзерву. Сярод іншых быў там і партрэт бацькі: у чыгуначным кіцелі, з эмблемай чыгуначных дарог – перакрыжаванымі малатком і разводным ключом – у пятліцах. На шчасце нашай сям'і, сярод паліцэйскіх аказаўся знаёмы бацькі, з якім некалі разам працавалі ў дэпо і гралі ў духавым аркестры, – Сямён Аляшкевіч. Ён сарваў фотаздымак з надпісам і некалькі іншых, сказаўшы гестапаўцам, што гэтыя людзі выехалі на ўсход. Праз некалькі дзён паліцэйскі зайшоў да нас дамоў, чым вельмі напалохаў, і перадаў бацьку гэты фотаздымак. Ад падарункаў за такую паслугу, якімі хацелі аддзячыць бацькі, ён адмовіўся. Хаця ўсё жыццё наша сям'я была ўдзячна гэтаму чалавеку за выратаванне бацькі, якога ён не выдаў.

У кінутым райкаме камсамола акупанты знайшлі не знішчаныя камсамольскія дакументы – ад поўных спісаў членаў ВЛКСМ гарадской арганізацыі, сельскіх ячэек, актывістаў, пратаколаў розных сходаў і пасяджэнняў, асабовых спраў (уліковых картак) да чыстых камсамольскіх білетаў.

У гады акупацыі навіны распаўсюджваліся людзьмі. Вялікае значэнне мелі ўсялякія чуткі. Вось і ў выпадку з арыштам камсамольцаў у горадзе і вёсках, а затым іх расстрэле, у Лунінцы казалі, што камсамольцаў выдаў гестапаўцам былы работнік Пінскага абкама «з усходнікаў», які асеў у горадзе і супрацоўнічаў з акупантамі. Сёння ўжо не ўдакладніць, праўда гэта ці не. Не імкнуліся да гэтага і адразу пасля вайны. Таму ў гісторыі акупацыі Лунінца так шмат невядомага. Яшчэ адны ўстойлівыя чуткі: што не была эвакуіравана наша ашчадная каса, што немцы захапілі ў ёй і нашым банку шмат савецкіх грошай.

Лунінец звесткі пра іх даходзілі ў скажоным, перабольшаным выглядзе. Але праўда ў іх усё ж была.

У 1943 годзе раптам пайшлі чуткі, што з Бранскага лесу (дзе ўладарылі партызаны) праз Беларусь і Украіну Сталін паслаў лясамі ў Германію вялікую армію з танкамі, самалётамі, гарматамі для захопу Берліна і палону Гітлера, якая пройдзе праз Лунінец. У горадзе паявіліся савецкія лістоўкі, гаварылі нават пра газеты. Усё гэта выклікала вялікі перапалох сярод акупантаў. Сталінская армія не прыйшла ў Лунінец, але пасля вайны даведаліся пра славутыя рэйды па тылах акупантаў партызанскага злучэння Каўпака, у тым ліку і па Пінскай вобласці.

Былі выпадкі, што ў гарадзе паяўляліся партызанскія лістоўкі, але да іх былі іншыя адносіны, чым да лістовак, скінутых з савецкага самалёта. Здаецца, у жніўні ці верасні 1943 года па Лунінцы разнесліся чуткі, што ноччу лятаў савецкі самалёт і так нізка, што немцы не маглі яго збіць. Пацвярджэннем гэтаму былі лістоўкі, знойдзеныя жыхарамі ў дварах, агародах, на дахах дамоў і хлявоў, у полі і лесе. У лістоўцы ад Савінфармбюро паведамлялася аб перамозе Чырвонай Арміі ў бітве на Курскай дузе, аб колькасці ўзятых у палон немцаў, знішчаных танках, гарматах, самалётах. Кожнае слова лістоўкі было вельмі важкім, усяляючым упэўненасць у хуткім вызваленні. Меўся і заклік: «Прачытай і перадай іншаму».

Акупанты былі вельмі заклапочаны паяўленнем лістовак. Паліцаі хадзілі па дварах, збіралі іх, лазілі па дахах. Было нават распараджэнне ваеннага каменданта здаваць лістоўкі ў камендатуру ці ў паліцыю. Наўрад ці хто рызыкнуў несці знаходку ў гэтыя небяспечныя ўстановы.

Лістоўкі над Лунінцам савецкія самалёты раскідвалі тройчы. Пер-

вінаград! Шмат фінікаў! Самыя лепшыя фрукты ў Лунінцы! Гандляваў таксама мясам і каўбасой, якія былі выраблены асобым, «каўказскім» спосабам. Гэтыя прадукты карысталіся вялікім попытам у лунінчан. Яго жонка прыняла хрысціянства, была вельмі набажнай, часта наведвала царкву разам з мужам, нават удзельнічала ў царкоўным савеце. Двое дзяцей таксама былі хрышчоны ў Лунінецкім храме. Але гэта не выратавала сям'ю ад «канчатковага рашэння яўрэйскага пытання». Іх расстралялі, як і вялікую групу так званых «усходнікаў», якія не паспелі эвакуіравацца ці засталіся ў горадзе па нейкіх іншых прычынах. Сярод забітых былі стаханаўцы, кіраўнікі, работнікі савецкіх арганізацый. Некалькі чалавек – наогул не лунінецкіх: спыніўшыеся ў горадзе бежанцы.

Была яшчэ адна трагічная і загадачная гісторыя, пра якую гаварылі ўпаўголаса. У Лунінцы засталася чамусьці жонка аднаго з работнікаў НКУС з 5-6-гадовым сынам. Хтосьці данёс пра гэта гестапа. Яе арыштавалі, трымалі разам з хлопчыкам у склепе былой павятовай гміны, на допытах збівалі. Потым чамусьці адпусцілі. Затым зноў арыштавалі. На расстрэл жанчыну з хлопчыкам вялі праз весь горад. Сына яна несла на руках. Расправа гестапаўцаў над бездапаможнай маці і дзіцём вельмі паўплывала на жыхароў, аб гэтым расказвалі са слязьмі на вачах. Ніхто не ведаў, што з намі будзе заўтра. Па даносу быў таксама расстраляны былы радавы работнік НКУС, які ажаніўся на дачцэ паважанага ў горадзе домаўладальніка Міхновіча з вуліцы Чырвоная.

**Л. КОЛАСАЎ.**

***(Працяг будзе.)***